*М.А. МАРТЫСЕВІЧ*

# ФАРМАЛЬНЫЯ МАДЫФІКАЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ СІСТЭМЕ ВЕРШАВАННЯ

Дается развернутое определение формам стихосложения, переходным между разными поэтическими канонами, литературой и другими художественными системами; предлагается их первичная классификация; выделяются некоторые социальные аспекты литературной маргинальности, особенности нетрадиционных форм современной белорусской поэзии.

The paper provides a comprehensive definition of the forms of versification that are transitional between different genre canons of poetry, between literature and other art systems, suggests their initial classification, identifies some of the social aspects of literary marginality and peculiarities of non-traditional forms in modern Belarusian poetry.

У сучаснай тэорыі літаратуры актуальнымі для навуковага даследавання з'яўляюцца тыя формы сучаснага вершавання, якія пакуль не набылі статус кананічных і адрозніваюцца ад традыцыйных, апісаных літаратуразнаўцамі як класічныя. У той жа час менавіта на перыферыі літаратурнага працэсу паўстаюць новыя, нетрывіяльныя з'явы, у тым ліку паэтычныя. Прымаючы да ўвагі некаторыя нетыповыя жанры і формы для беларускага вершавання мяжы XX-XXI ст., адзначаючы іх пэўную неадпаведнасць сучаснаму беларускаму паэтычнаму канону, мы паспрабуем скласці цэласную карціну перспектыўнага і маргінальнага ў сучаснай беларускай паэзіі.

Паняцце маргінальнасці (ад лац. margo - край, мяжа) было актуалізавана ў навуковым дыскурсе ў 1920-1930 гг. сацыёлагам чыкагскай школы Р. Паркам і традыцыйна ўжывалася ў сацыяльнай філасофіі, але ў другой палове XX ст. стала шырэй выкарыстоўвацца ў гуманітарнай сферы. Ва ўласна філасофскім сэнсе маргінальнасць разумеецца як «спецыфічнасць розных культурных феноменаў, часта асацыяльных, якія: а) развіваюцца паза дамінантнымі ў тую ці іншую эпоху правіламі рацыянальнасці; б) не ўпісваюцца ў сучасную ім пануючую парадыгму мыслення; в) даволі часта агаляюць супярэчнасці і парадоксы магістральнага напрамку развіцця культуры»* (Усманова 1998, 593). У сацыялогіі «ў сітуацыі маргінальнасці аказваюцца так званыя "культурныя гібрыды", што балансуюць паміж дамінуючай у соцыуме групай, якая ніколі не прымае іх цалкам, і групай, з якой яны вылучыліся» (Усманова 1998, 593). У працах постструктуралістаў (Р. Барт, Ж. Дэрыда, М. Фуко) паняцце было дапасавана да тэорыі літаратуры. Пытанне «цэнтральнасці/маргінальнасці» востра стаіць пры азначэнні, апісанні і класіфікацыі працэсу не толькі сацыяльнага, але і творчага, пра што, на думку ўкраінскай даследчыцы С Паўлычка, сведчыць вялікая колькасць навуковых прац, у якіх вучоныя закранаюць асобныя аспекты праблемы ўжо не ў філасофскім, а ў літаратурным вымярэнні (Павличко 2002, 622).

Савецкіх/постсавецкіх тэарэтыкаў феномен літаратурнай маргінальнасці зацікавіў адносна нядаўна (працы, на якія мы спасылаемся, пабачылі свет у другой палове 1990-х гг.). Паняцце «маргінальнасць» набыло тэрміналагічны характар у розных эстэтычных канвенцыях, у розных нацыянальна-культурных кантэкстах. С. Паўлычка, разглядаючы маргінальнасць як аб'ект тэорыі, засяроджвае ўвагу на гістарычным супрацьстаянні ўкраінскай літаратуры расійскаму літаратурнаму «цэнтру», закранаючы такім чынам агульныя пытанні канону і маргінэсу ва ўкраінскай літаратуры (Павличко 2002, 627). У даследаванні маргінальных сістэм рускага вершавання С. Кармілава (гл. Кормилов 1995) разглядаюцца нехарактэрныя для рускай паэзіі метрычныя прыёмы, а таксама апісваюцца вершавыя сістэмы, пера-

* Тут і далей пераклад аўтара. - *М. М.*

ходныя ад паэзіі да прозы. Займаючыся найперш метрыкай, С. Кармілаў дапасоўвае паняцце маргінальнасці да сістэмы рускага вершавання наступным чынам: «Маргінальныя сістэмы верша маюць сутнасна розны характар. Гэта можа быць сутык:

а) розных сістэм вершавання;

б) верша і асаблівасцей творчага працэсу, вынікам якога гэты верш з'яўляецца;

в) верша і звышвершавых прыкмет твора, галоўным чынам, устойлівых арэолаў, у тым ліку звязаных з іншамоўнымі культурамі, культурным мінулым і ўвогуле з іншымі культурнымі пластамі;

г) верша і прозы;

д) паэзіі і не-паэзіі, сінкрэтычных і сінтэтычных сфер чалавечай практыкі;

е) метра-рытмічнай арганізацыі тэксту і спосабаў яго гукавой і візуальнай рэалізацыі (спевы, дэкламацыя, спецыфічная форма запісу і друкаванага набору)» (Кормилов 1995, 4).

Даследчыца дынамікі стылёвых плыней сучаснай расійскай літаратуры Г. Няфагіна таксама вылучае паняцце маргінальнага ў літаратуры праз канцэпты «памежнага», «прамежкавага», «пераходнага»: «Маргінальныя стылі паўстаюць у перыяды сацыякультурных трансфармацый. Іх [памежны] статус вызначаецца тым, што яны суаднесены з рознымі мастацкімі сістэмамі, заснаванымі на супрацьлеглых прынцыпах, і пры гэтым не ўключаныя ні ў адну з іх цалкам» (Нефагина 2000, 147). Змены, што адбыліся ў апошнія 14-15 гадоў на Беларусі, безумоўна, аказалі ўплыў на літаратурны працэс у нашай краіне. Для беларускага літаратурнага кантэксту актуальна гучыць і наступная думка Г. Няфагінай: «У рускай прозе найбольш цікавыя мастацкія феномены паўстаюць на мяжы розных эстэтычных сістэм, розных стыляў і жанраў» (Нефагина 2000, 150). Тое ж можна сказаць пра беларускае вершаванне: на нашу думку, тыя формы верша, якія мы вызначаем як мадыфікацыі вядомых жанраў або формы маргінальныя для ўсходнеславянскага вершавання, - гэта арыгінальныя з'явы сучаснай беларускай літаратуры, арыгінальныя ў першую чаргу сваёй неаднароднай структурай, у якой звычайна сумешчаны прыкметы разнародных жанраў (напрыклад, санет-цэнтон, паліндрамічная паэма) або адзнакі кантрастных культур (паэзія рубаі на беларускай мове).

Формы такога кшталту мы вызначаем як паэтычныя структуры, якія паўстаюць на мяжы дзвюх розных сістэм (прозы і паэзіі, розных літаратурных традыцый або розных відаў мастацтва); амаль заўсёды не маюць працяглай традыцыі ў гэтай літаратуры; займаюць перыферыйнае, другаснае значэнне ў параўнанні з асноўнымі (традыцыйнымі, стрыжнёвымі, магістральнымі) жанрамі нацыянальнай літаратуры ў канкрэтныя перыяды яе развіцця.

С. Паўлычка сцвярджае, што «ў перыяды аўтанамізацыі, "адлому" ад расійскага цэнтра на першы план высоўваюцца ўнутраныя парадыгмы [украінскай] літаратуры, фарміруецца яе ўнутраны цэнтр (канон, афіцыйная лінія) і адпаведна яе маргінэсы (дэкананізацыйныя, авангардныя, дэструктыўныя тэндэнцыі)» (Павличко 2002, 627). Звернем увагу на тое, што паняцце «маргінэс» украінская даследчыца ўжывае як сінанімічнае тэрмінам (пост)мадэрнісцкага кшталту. Прымаючы да ўвагі падабенства развіцця ўкраінскай і беларускай літаратуры на сучасным этапе і ўлічваючы абодва значэнні паняцця «маргінальнасць» (не толькі «памежжа», але і «край»), мы, услед за С. Паўлычка, таксама можам разглядаць плён беларускай лтаратуры з адзнакамі постмадэрнісцкай паэтыкі як з'яву маргінальнага характару перш за ўсё ў дачыненні да прадмета нашага даследавання - сістэмы беларускага вершавання 1900-х гг. XX - пачатку XXI ст. Да такіх феноменаў у сучасным беларускім вершаванні мы можам аднесці розныя эксперы-

менты з паэтычнымі формамі (напрыклад, эксперыментальныя санеты Ю. Пацюпы (гл. Пацюпа 2001) і С. Мінскевіча (гл. Мінскевіч 2002)), а таксама некаторыя ўзоры авангардных напрамкаў сучаснай паэзіі.

У розныя перыяды развіцця той ці іншай нацыянальнай літаратуры некаторыя малаактуальныя ці зусім не запатрабаваныя раней жанры тэарэтычна могуць станавіцца дамінуючымі, цэнтральнымі (у гэтым плане цікавы лёс верлібра, які ў параўнанні з папярэднімі эпохамі атрымаў у сучаснай усходнеславянскай паэзіі надзвычай шырокае выкарыстанне) або, наадварот, некаторыя стрыжнёвыя формы з-за якіх-небудзь стрымліваючых фактараў могуць заняць маргінальнае становішча. Напрыклад, санеты ў беларускай літаратуры 1930-х катэгарычна не прымаліся сацрэалістычнай крытыкай, хаця ў папярэднія дзесяцігоддзі паэтамі (Я. Купалам, М. Багдановічам) і тэарэтыкамі (А. Барычэўскім) было шмат зроблена для адаптацыі гэтай формы да маладой беларускай літаратуры. Таму, разважаючы пра маргінальнасць тых ці іншых вершавых формаў або жанравых мадыфікацый, мы будзем мець на ўвазе творчасць ад 1991 г. да сучаснага перыяду, абумоўленага новай літаратурнай сітуацыяй, што склалася пад уплывам гістарычных пераўтварэнняў у краіне, і таму, на нашу думку, можа быць азначаны як час існавання сучаснай беларускай паэзіі.

На сучасным этапе маргінальныя жанры беларускай паэзіі можна класіфікаваць (паводле іх месца ў паэтычнай сістэме) наступным чынам:

1. На сутыкненні розных светапоглядна-мастацкіх сістэм: літаратуры і фальклору («садысцкія вершыкі» (т. зв. жахалкі), вершаваныя анекдоты («фрашкі», якія, паходзячы з польскай літаратуры, маюць багатую традыцыю і ў беларускай); літаратуры і выяўленчага мастацтва (візуальная паэзія). 2. На сутыкненні дзвюх розных паэтычных традыцый, якія часта належаць да кантрастных культур (хайку, лімерыкі, газэлі, рубаі і іншыя экзатычныя жанры па-беларуску). 3. Архаічныя метрычныя сістэмы ў сучасным сілабатанічным кантэксце (антычныя памеры, сілабіка). 4. Вершаваныя эксперыменты (эксперыментальныя санеты, трыялеты, цэнтоны і г. д.). 5. Аўтарскія жанры (грэгерыі*, вершаказы, пункціры, зномы А. Разанава, «ліхтарыкі» Г. Ліхтаровіча). 6. Вершаваныя гульні (бурымэ, бяскрылкі**).

Прымаючы да ўвагі папулярнасць у сусветнай літаратуры некаторых вершаваных формаў, азначаных намі вышэй як маргінальныя, неабходна згадаць пра маргінальнасць гэтых жанраў і ў сацыяльным значэнні. Даволі часта гэтыя жанры практыкуюць паэты-аматары, таксама шырока выкарыстоўваюць школьныя настаўнікі літаратуры ў дыдактычных мэтах. Некаторыя вучэбныя дапаможнікі, напрыклад, рэкамендуюць развівальныя ўрокі па візуальнай паэзіі, а таксама ўрокі паэзіі лімерыка ці хайку. У рускамоўным Інтэрнэце хайку сталі сапраўды народнай паэзіяй. Вялікай папулярнасцю карыстаецца рэсурс «Сад расходящихся хокку» - гіпертэкставы зборнік паэзіі хайку. Жадаючыя могуць «пасадзіць» у «сад» свае нарыхтоўкі, а таксама скласці хайку на зададзены радок (маем хайку-бурымэ - прыклад гульнёвай паэзіі). Пры гэтым спецыяльная праграма сочыць за тым, каб наведвальнікі сайта не парушалі прынцып 5-7-5. Гэта пацвярджае папулярнасць некаторых жанраў, аднак сігналізуе пра небяспеку іх «дэпаэтызацыі» ў масавай свядомасці і сведчыць, што колькасны паказчык не можа быць вызначальным, калі мы кажам пра маргінальнасць тага ці іншага жанру.

* Грэгерыя - жанр сярэднявечнай іспанскай літаратуры (у беларускай літаратуры жанр развівае і пашырае Адам Глобус), мадэрнізаваны ў пачатку XX ст. паэтам Рамонам Гомесам дэ ля Серна. Кароткі аднаверш, які нясе ў сабе яркую метафару.

** Бяскрылка - від паэтычнай гульні, які ўяўляе сабою верш, у якім змяшчаецца крылатая альбо вядомая фраза - «крыло». Гульцам прапануецца запоўніць пропуск - у «целе» бяскрылкі - вершы без «крыла». Падказкаю з'яўляецца ня толькі сэнс верша, але і рыфма, рытм.

У сувязі з гэтым перад даследчыкам маргінальных жанраў паўстае важная праблема размежавання графаманіі і высокай паэзіі. Адзначым, што перанасычанасць сучаснай культурнай прасторы творамі масавай літаратуры часам адштурхоўвае даследчыкаў ад паэтычных з'яў такога тыпу.

На сучасным этапе ўжыванне маргінальных вершаваных формаў мае выразны сацыякультурны аспект, што асабліва прасочваецца на прыкладзе рускамоўнай паэзіі. Аўтарамі ствараецца паэзія-эксперымент, паэзія-гульня, паэзія-жарт, і большасць цвёрдых страфічных формаў, жанраў і іх мадыфікацый у той ці іншай ступені нясуць у сабе прыкметы «недапаэтычнасці». У смехавым плане варта адзначыць традыцыю «дане макабр» у такім фальклорна-літаратурным жанры, як жахалка, ці такі паджанр, як травестыйнае хайку (парадыйныя трохрадкоўі, якія спалучаюць высокую паэтыку перакладных японскіх хайку і штодзённую, зніжаную тэматыку, пабудаваныя на кантрасце традыцыйнай усходняй і сучаснай постсавецкай ментальнасці; атрымалі распаўсюджванне ў рускай гумарыстычнай паэзіі). У гульнёвым плане варта звярнуць увагу на «бурымічнасць» жанру лімерыка. Вядома, што ў ірландскім фальклоры складанне лімерыкаў мела характар спаборніцтва: рыбакі ў пабах ладзілі турніры экспромтаў, дзе для перамогі трэба было праспяваць лімерык больш смешны, чым за сталом саперніка. Структуралісты Тартускай школы Д. Сегал і Т. Цыўян досыць трапна параўналі лімерыкі з дзіцячай гульнёй у «бязглуздзіцу»: «Даследаванне лімерыкаў цікавае, дзякуючы асноўнай асаблівасці гэтага жанру, - лімерыкі належаць да таго роду паэзіі, якi ўмоўна можна назваць паэзіяй сінтэзу. Нескладаныя і ў той жа час жорстка рэгламентаваныя фармальныя правілы складання лімерыкаў (гэта значыць, алгарытм сінтэзу), даступныя кожнаму. Таму складанне лімерыкаў ператвараецца ў гульню-спаборніцтва, калі лімерык супрацiўніка цікавы і значны толькі ў параўнанні са сваім уласным. Вядома ж, лімерык - не адзіны від паэзіі сінтэзу, узяць хаця б бурымэ, прыпеўкі, інданезійскія пантумы і да т. п.» (Сегал, Цивьян 1965, 321). Аднак у беларускай літаратуры ў сувязі з асаблівасцямі яе развіцця і рускамоўнасці беларускай масавай культуры маргінальныя вершаваныя формы пакуль што застаюцца ў сферы рафінаванай паэзіі, і ў гэтым важную ролю адыгрываюць паэты-культуртрэгеры, якія імкнуцца захоўваць класічны канон таго ці іншага жанру, адаптаваць яго да беларускай літаратуры. Для беларускіх паэтаў нетрадыцыйныя формы вершаў з'яўляюцца яшчэ і адзнакай «цэхавасці». З дапамогай маргінальных формаў ажыццяўляецца повязь з культурай іншых народаў: *«Вішня расцвіла/ за тысячы кіламетраў/ ад Японіі»* (Antihomer 2004, 90), «псеўдаанглійскі нонсэнс беларускіх гарадоў і вёсачак» (Хадановіч 2005, 7), а таксама з еўрапейскай паэтычнай традыцыяй. М. Баярын стылізуе антычную метрыку, спрабуючы актуалізаваць класічных аўтараў сродкамі паэтыкі постмадэрнізму: *«Стварыць Гамера не так складана, як падаецца на першы погляд»* (Баярын 1999, 157). Сучасная сілабіка Ю. Пацюпы - гэта «туга па беларускім барока, ракако, класіцызме» (Пацюпа 2001, 89), а такая авангардная праява вершавання, як каліграма, адсылае да традыцыі візуальных вершаў Сімяона Полацкага.

Такім чынам, некаторыя даследуемыя намі фармальныя мадыфікацыі беларускай сістэмы вершавання - гэта з'явы, якія нясуць у сабе прыкметы некалькіх памежных мастацкіх сістэм, культур, традыцый ці існуюць як плён аўтарскага эксперыменту, што і з'яўляецца іх асноўнай прыкметай, а таксама падставай для вылучэння і класіфікацыі. Таму гэтыя паэтычныя феномены выконваюць істотную функцыю пасрэдніцтва паміж культурамі, эпохамі, літаратурай і соцыумам. Такі падыход, на нашу думку, значна спрашчае даследаванне азначаных феноменаў, дае магчымасць вызначыць іх месца

ў сістэме той ці іншай нацыянальнай літаратуры, а таксама ўключыць у кампетэнцыю літаратуразнаўства памежныя з літаратурай мастацкія фор-мы (напрыклад, візуальную паэзію, аўтарскую песню, вершаваныя гульні і інш.). У гэтым плане мы лічым маргінальнасць як літаратурную з'яву (пост)мадэрнісцкага кшталту актуальным і перспектыўным полем навуковага пошуку.

ЛІТАРАТУРА

Antihomer. Квазіхайку // Маладосць. 2003. № 12. С 89-92.

Баярын М. Безназоўнае // Крыніца. 1999. № 9 (55).

Кормилов С.И. Маргинальные системы русского стихосложения. М., 1995.

Мінскевіч С. Мінскія/Менскія санэты. Мн., 2002.

Нефагина Г.Л. Маргинальные стили в русской прозе XX в. // Славянская літаратура ў кантэксце сусветнай: Зб. дакл. навук. канф.: У 2 ч. Мн., 2000. Ч. 2. С. 147-150.

Усманова А.Р. Маргинальность // Новейший философский словарь / Сост. А.А. Грицанов. Мн., 1998.

Павличко С.Д. Теорія літератури. Київ, 2002.

Пацюпа Ю. Мезальянсы, альбо Юрлівыя санеты // ARCHE-Скарына. 2001. № 1. С. 89-102.

Сегал Д.М., Цивьян Т.В. К структуре английской поэзии нонсенса (на материале лимериков Э. Лира) // Учен. зап. Тарт. гос. ун-та / Тр. по знаковым системам. Тарту, 1965. С. 320-329.

Хадановіч А. Землякі, альбо Беларускія лімерыкі. Мн., 2005.

Паступіў у рэдакцыю 15.02.06.

***Марыя Аляксандраўна Мартысевіч*** - аспірантка кафедры тэорыі літаратуры. Навуковы кіраўнік-доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі літаратуры В.П. Рагойша.